*В. Р. Швайко*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*V. Shvaiko*
National Institute For Higher Education, Minsk

**УДК 94:37.07(476+438)“19/20”**

# БЕЛАРУСКАЯ АДУКАЦЫЯ Ў ПОЛЬШЧЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX – ПАЧАТКУ XXI СТ.

# BELARUSIAN EDUCATION IN POLAND IN THE SECOND HALF OF THE XX - EARLY XXI CENTURY

*Артыкул прысвечаны праблеме захавання і развіцця беларускай адукацыі ў Польшчы ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Разглядаюцца пытанні стварэння і дзейнасці беларускамоўных устаноў адукацыі, аналізуюцца фактары негатыўнага ўздзеяння на стан беларускай адукацыі, вызначаюцца прычыны зніжэння актыўнасці беларускамоўных адукацыйных устаноў у розныя перыяды.*

*Ключавыя словы: адукацыя; нацыянальная меншасць; беларускамоўныя школы; беларусістыка; грамадскія аб’яднанні; Беларускае грамадска-культурнае таварыства.*

*The article is devoted to the problem of preservation and development of Belarusian education in Poland in the second half of the XX century - the beginning of the XXI century. The article considers the issues of creation and activity of Belarusian-language educational institutions, educational sites, analyzes the factors influencing the state of Belarusian education and training, identifies the reasons for the decrease in the number of Belarusian-language educational institutions in different periods.*

*Keywords: education; national minority; Belarusian-language schools; Belarusian studies; public associations; Belarusian public and cultural society.*

На тэрыторыі сучаснай Польшчы пражывае значная колькасць беларускага насельніцтва, якое мае статус нацыянальнай меншасці. У 1945 г., згодна з савецка-польскімі дамовамі аб дзяржаўнай мяжы, у склад Польшчы ўвайшла частка этнічных беларускіх земляў. Пытанне аб вызначэнні дакладнай колькасці беларусаў у Польшчы дагэтуль з’яўляецца дастаткова складаным, у розныя перыяды колькасць беларускага насельніцтва азначалася даволі палярнымі лічбамі: ад 200 да 50 тысяч [1, с. 23]. Значнаму скарачэнню беларускага насельніцтва ў Польшчы ў другой палове XX ст. актыўна спрыялі працэсы пасляваеннай рэпатрыяцыі, эміграцыя, а таксама актыўная асіміляцыйная палітыка польскай дзяржавы ў адносінах да беларускай нацыянальнай меншасці. Паводле дадзеных апошняга перапісу насельніцтва 2011 г., у Польшчы пражывае каля 47 тыс. этнічных беларусаў [2]. Абсалютная большасць з іх – у Падляскім ваяводстве (больш за 96 % ад агульнай колькасці анкет, пададзеных беларусамі падчас перапісу), таму

пытанні захавання і развіцця беларускай асветы ў Польшчы характэрныя менавіта гэтаму рэгіёну, абсалютна ўсе адукацыйныя ўстановы, дзе вучылі на беларускай мове ці навучалі беларускай мове (апрача вышэйшай адукацыі), геаграфічна месціліся на Падляшшы. Дэмаграфічны фактар у дадзенай сітуацыі з'яўляецца асноватворным.

Гісторыя развіцця беларускай адукацыі ў Польшчы ў другой палове XX ст. уключае некалькі перыядаў, адметных колькасцю, формамі і задачамі функцыянавання беларускіх адукацыйных устаноў. Практычна адразу пасля вызвалення ад немцаў на Беласточчыне пачалі адкрывацца школы з беларускай мовай навучання. Ужо ў 1944 г. тут налічвалася 117 пачатковых школ і тры сярэднія школы, дзе навучанне вялося па-беларуску – у Гайнаўцы, Бельску і Беластоку. На жаль, палітычная сітуацыя, а таксама бачанне польскім урадам «Польшчы без нацыянальных меншасцяў» не спрыяла бесперапыннаму развіццю беларускай адукацыі. Пасля падзей, звязаных з усталяваннем мяжы і ўзаемнай рэпатрыяцыяй палякаў і беларусаў, у перыяд 1945–1947 гг. адбываўся актыўны працэс ліквідацыі беларускіх школ, які тлумачыўся тым, што беларусы выязджаюць у Савецкую Беларусь, а таму школы нікому не патрэбныя. Вельмі часта школы зачыняліся і па даволі празаічнай прычыне – не хапала метадычных матэрыялаў, падручнікаў і самае важнае – не хапала кваліфікаваных настаўнікаў (многія з'ехалі ў Беларусь ці адышлі ад школьнай працы па палітычных матывах). Справа скончылася тым, што на Падляшшы ў 1947 г. засталося толькі шэсць беларускамоўных школ. Навучальныя ўстановы маглі ліквідаваць таксама і па палітычных матывах, як адбылося з ліцэем у Бельску: яго зачынілі па прычыне «сепаратысцкай дзейнасці настаўнікаў» [3, с. 211].

Аднак палітычныя змены ў краіне пацягнулі за сабой і змены ў сферы беларускай адукацыі. 28 чэрвеня 1949 г. ЦК ПАРП прыняў рашэнне аб тым, што Міністэрства адукацыі Польшчы павінна ствараць умовы для таго, каб дзеці беларускай нацыянальнасці на Беласточчыне маглі вучыцца на роднай мове [4]. Як вынік, 1 верасня 1949 г. былі адчынены 24 школы з беларускай мовай навучання. У канцы навучальнага года іх было ўжо 39, а з новага 1949/1950 навучальнага года пачалі працаваць таксама ліцэі ў Бельску і Гайнаўцы [3, с. 216]. У першыя гады свайго аднаўлення беларускія школы перажывалі шмат праблем: не хапала настаўнікаў, не было падручнікаў, часам нават памяшканняў. Але, нягледзячы на ўсе цяжкасці, беларуская асвета ў Польшчы дадзены перыяд даволі актыўна развівалася. Школы для дзяцей беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы масава адкрываліся ў вёсках на тэрыторыі пяці паветаў Падляскага ваяводства: Беластоцкага, Бельскага, Гайнаўскага, Семятыцкага і Сакольскага. Найбольшая іх колькасць працавала ў Бельскім і Гайнаўскім паветах: тут былі як школы з беларускай мовай навучання (усе прадметы выкладаліся на роднай мове), так і школы з дадатковым вывучэннем беларускай мовы (мова вывучалася як прадмет).

У Беластоцкім, Сакольскім і Семятыцкім паветах працавалі школы толькі з дадатковым вывучэннем беларускай мовы.

60-я гг. XX ст. сталі перыядам найвялікшага росквіту беларускай асветы ў Польшчы, гэтаму спрыяла даволі лаяльная палітыка польскай дзяржавы, а таксама актыўная дзейнасць па падтрымцы беларускамоўных школ Беларускага грамадска-культурнага таварыства (далей – БГКТ) [5, с. 40]. Найбольшая колькасць беларускіх навучальных устаноў была адчынена ў 1961/1962 навучальным годзе: 37 пачатковых школ з беларускай мовай навучання і 141 школа, дзе беларуская мова вывучалася як прадмет (табліца 1).

*Табліца 1*

**Школы з беларускай мовай навучанняі [6]**

| | Школы з беларускай мовай навучання | Колькасць вучняў | Школы з вывучэннем беларускай мовы | Колькасць вучняў | Усяго школ | Усяго вучняў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1960/1961 | 39 | 2643 | 135 | 7939 | 174 | 10582 |
| 1961/1962 | 37 | 2636 | 141 | 8147 | 178 | 10783 |
| 1962/1963 | 34 | 2266 | 137 | 8550 | 171 | 10816 |
| 1963/1934 | 34 | 2378 | 141 | 8724 | 175 | 11102 |
| 1964/1965 | 34 | 2329 | 139 | 8612 | 173 | 10941 |
| 1965/1966 | 33 | 2286 | 139 | 8616 | 172 | 10902 |
| 1966/1967 | 31 | 2317 | 141 | 9452 | 172 | 11769 |
| 1967/1968 | 30 | 2276 | 139 | 9727 | 169 | 12003 |
| 1968/1969 | 30 | 2082 | 134 | 9650 | 164 | 11732 |
| 1969/1970 | 22 | 1353 | 142 | 9938 | 164 | 11291 |

Негатыўнай тэндэнцыяй таго часу стала тое, што адбывалася пастаяннае скарачэнне колькасці школ, дзе ўсе прадметы вывучаліся на беларускай мове, на карысць тых, дзе беларуская мова вывучалася як прадмет. Вельмі часта гэты працэс тлумачылі так: дзеці павінны добра ведаць дзяржаўную мову, менавіта ад гэтага будзе залежыць іх далейшы лёс. У выніку часта назіралася такая з’ява, калі бацькі вучняў школ з беларускай мовай навучання пісалі заявы, каб некаторыя прадметы (а паступова і большая іх частка) выкладаліся па-польску, матывуючы гэта патрэбамі далейшага жыцця

моладзі. Напрыканцы згаданага дзесяцігоддзя пачала скарачацца і агульная колькасць беларускіх пачатковых школ.

Апрача пачатковых школ, у дадзены перыяд на Беласточчыне працавалі і сярэднія навучальныя ўстановы: два ліцэі з беларускай мовай навучання – у Гайнаўцы і Бельску Падляскім, а таксама ліцэй з дадатковым вывучэннем беларускай мовы ў Міхалове (Беластоцкі павет). Выпускнікі беларускіх сярэдніх школ мелі магчымасць атрымоўваць адукацыю ва ўсіх вышэйшых навучальных установах Польшчы.

Дзякуючы намаганням БГКТ, у 1957/1958 навучальным годзе для тых выпускнікоў беларускіх ліцэяў, якія хацелі працягваць беларускую адукацыю далей, пры Варшаўскім універсітэце была адкрыта адзіная на той час за межамі Беларусі кафедра беларускай філалогіі. Заснавальнікам кафедры была славіст прафесар А. Абрэмская-Яблонская. У першыя гады існавання кафедры метадычную і навуковую дапамогу ёй аказвалі шматлікія спецыялісты з Беларусі. З цягам часу быў сфарміраваны выкладчыцкі калектыў, у склад якога ўваходзілі Э. Смулкова, А. Баршчэўскі, А. Багроўская, М. Врублеўскі, З. Скібінская. Навуковыя інтарэсы выкладчыкаў кафедры беларускай філалогіі знаходзіліся ў сферах беларускага мовазнаўства і гісторыі беларускай літаратуры з шырокім улікам даследаванняў фальклору Беласточчыны. У 1970–1980-я гг. калектывам кафедры быў выдадзены шматтомны «Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча». На чале кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта працавалі вядомыя навукоўцы А. Абрэмская-Яблонская, Э. Смулкова, А. Баршчэўскі і інш. У 1992 г. пры філіяле Варшаўскага ўніверсітэта ў Беластоку быў створаны аддзел беларусістыкі, які з 1998 г. быў пераўтвораны ў кафедру беларускай філалогіі, якая ўваходзіла ў структуру Інстытута ўсходнеславянскай філалогіі ўніверсітэта ў Беластоку. Яе кіраўніком у 1992–2004 гг. быў прафесар М. Кандрацюк. З 2004 г. кафедру ўзначальвала прафесар Г. Тварановіч. З 2000 г. на кафедры рыхтавалі студэнтаў па спецыяльнасці «Беларуская філалогія». У сучасны момант кафедра рэарганізавана да аддзела беларусістыкі і ўсходніх даследаванняў у складзе кафедры філалагічных даследаванняў «Усход-Захад» (на чале аддзела – прафесар Г. Тварановіч). У 1997 г. ва ўніверсітэце ў Беластоку была заснавана кафедра беларускай культуры. Стваральнікам і першым яе кіраўніком стала прафесар Э. Смулкова, потым доўгія гады кафедру ўзначальваў прафесар Я. Мірановіч, затым кароткі час – прафесар Л. Цітка. На дзеючы момант дзейнасць кафедры скасавана. Некаторы час дзейнічалі аддзел беларусістыкі ва ўніверсітэце імя М. Складоўскай-Кюры ў Любліне (кіраўнік – прафесар М. Саевіч) і аддзел беларусістыкі і ўкраіністыкі ў Апольскім універсітэце (кіраўнік – прафесар Б. Кодзіс).

З мэтай забеспячэння кадрамі настаўнікаў для беларускіх школ з 1954 г. па 1965 г. пры Завочных настаўніцкіх курсах у Беластоку была арганізавана

праца аддзялення беларускай філалогіі [6]. За перыяд яго існавання вышэйшую настаўніцкую кваліфікацыю тут атрымалі 139 настаўнікаў. У 1949/1950 навучальным годзе польскімі ўладамі было прынята рашэнне аб адкрыцці ў Беластоку Педагагічнага ліцэя з беларускай мовай навучання. З наступнага і па 1969/1970 навучальны год Педагагічны ліцэй працаваў у Бельску Падляскім. За гэты перыяд дыпломы настаўнікаў беларускай мовы атрымалі 427 выпускнікоў, якія працаўладкоўваліся ў беларускамоўныя пачатковыя школы. Педагагічны ліцэй у Бельску быў зачынены ў 1970 г. быццам бы па прычыне рэформы сістэмы адукацыі для настаўнікаў пачатковых школ. Фактычна ж гэта адбылося ў агульным рэчышчы пагаршэння стану беларускамоўнай адукацыі, якое прыйшлося менавіта на 1970-я гг.

70-я гг. XX ст. для беларускай асветы ў Польшчы сталі амаль катастрафічнымі, што было абумоўлена як дзяржаўнай палітыкай, так і міграцыйнымі і ўрбаністычнымі грамадскімі працэсамі. У 1970/1971 навучальным годзе школы з беларускай мовай навучання перасталі існаваць – родная мова з гэтага часу пачала выкладацца толькі як дадатковы прадмет. З цягам часу колькасць і такіх школ скарацілася: у 1973/1974 навучальным годзе працавалі толькі 103 школы, дзе мову вывучалі 5983 вучні. Напачатку 1970-х гг. у беларускіх школах пачалі з'яўляцца іншыя праблемы: дзяржава перастала друкаваць падручнікі, настаўнікі не мелі магчымасці павышаць кваліфікацыю. Пачало панаваць масавае меркаванне, што беларуская мова ў польскай дзяржаве нікому не патрэбна. У 1971 г. Міністэрства адукацыі Польшчы выдала распараджэнне, сутнасць якога зводзілася да «поўнай дабравольнасці ў навучанні беларускай мове» [4, с. 66]. Згодна з пастановай, бацькі тых дзяцей, што жадаюць вывучаць беларускую мову, кожны год павінны былі пісаць спецыяльныя заявы. Адсутнасць такіх заяў з'яўлялася падставай да скасавання вывучэння мовы ў навучальнай установе. Апрача таго, школьныя ўлады для тых школ, дзе вывучалася беларуская мова, давалі параду кшталту «гэты прадмет павінен выкладацца на першым ці апошнім уроку», што таксама не спрыяла высокаякаснаму вывучэнню мовы. Сітуацыю значна пагоршыла і школьная рэформа першай паловы 1970-х гг. Падчас яе правядзення было ліквідавана 70 невялікіх пачатковых школ, дзе вывучалася беларуская мова, а ў новых школах, куды накіроўваліся вучні, такога прадмета часцей за ўсё не было. Апрача таго, падчас рэформы беларускую мову перасталі выкладаць яшчэ ў 26 школах. У выніку ў 1980/1981 навучальным годзе беларускую мову ў Польшчы вывучалі толькі 3430 вучняў. На гэтым фоне значным, хоць і кароткатэрміновым поспехам беларускай грамадскасці можна лічыць тое, што ў 1982 г. у Беластоцкім ліцэі № 1 пяць вучняў пачалі вывучэнне беларускай мовы, але ў хуткім часе з-за малой колькасці вучняў выкладанне было спынена.

БГКТ і іншыя беларускія грамадскія арганізацыі ў 1990-я гг. сталі зноў вялікую ўвагу надзяляць пытанню адраджэння беларускай асветы ў Польшчы. Сітуацыя была даволі складанай. У гэты час беларускую мову як дадатковы прадмет вывучалі толькі трохі больш за 3500 чалавек у 44 школах. Вялікай праблемай стаў катастрафічны недахоп метадычнай і навуковай літаратуры, настаўнікі не мелі магчымасцей павышаць кваліфікацыю. БГКТ змагло аказаць значную дапамогу ў вырашэнні гэтай праблем. Дзякуючы падтрымцы з боку Рэспублікі Беларусь, БГКТ наладзіла перадачу дзіцячай літаратуры, падручнікаў, газет у школы, дзе вывучалася беларуская мова; узнавіла практыку правядзення ў мінскіх вышэйшых навучальных установах павышэння кваліфікацыі для настаўнікаў; па хадатайніцтву БГКТ у 1990-я гг. у навучальных установах Рэспублікі Беларусь вышэйшую адукацыю атрымоўвалі выпускнікі беларускіх ліцэяў. Беларускія ўлады аказвалі дапамогу і ў афармленні кабінетаў беларускай мовы. Пастаянна наладжваліся курсы і метадычныя канферэнцыі настаўнікаў беларускай мовы, вядучымі метадыстамі сталі Т. Русачык, В. Сянкевіч, І. Рыгаровіч [7, с. 286].

У сярэдзіне 1990-х гг. магчымасць вывучаць беларускую мову атрымалі і дзеці, якія жылі ў Беластоку. З 1995 г. у дзіцячым садку № 14 пачалі працу беларускамоўныя групы. Вялікую ўвагу педагогі садка надавалі выхаванню дзетак на традыцыях беларускай культуры: тут працавалі тэатральная група, дзіцячы песенны калектыў «Вясёлка». Далейшае вывучэнне беларускай мовы беластоцкія дзеці на дадзены момант могуць працягваць у пачатковай школе № 4, а таксама ў гімназіі № 7 і агульнаадукацыйным ліцэі № 2. Выхавацелі і настаўнікі беларускай мовы г. Беластока цесна супрацоўнічаюць з грамадскім аб'яднаннем «АБ-БА» («Аб'яднанне бацькоў, беларускасцю апантаных»). Многія гады яго ўзначальвае Б. Пякарская, актыўна з ім працуе настаўніца беларускай мовы А. Ваўранюк. Для дзяцей, якія вывучаюць беларускую мову, «АБ-БА» рэалізуе шмат працтаў: дзейнічае тэатральны гурток, дзеці займаюцца дэкламатарскім мастацтвам (неаднаразова станавіліся пераможцамі і лаўрэатамі конкурсаў БГКТ «Роднае слова» і Агляд тэатральных калектываў), сумесна з арганізацыяй літоўскай нацыянальнай меншасці «АБ-БА» рэалізавалі праект «Вялікае Княства Літоўскае – наша агульная спадчына». На сённяшні дзень беларускую мову як дадатковы прадмет дзеці маюць магчымасць вывучаць у 22 пачатковых школах, 14 гімназіях Падляся, а таксама ў 3 агульнаадукацыйных ліцэях – у Гайнаўцы, Бельску Падляскім і Беластоку [7, с. 286].

Такім чынам, намаганні грамадскіх арганізацый беларускай меншасці, падтрымка Рэспублікі Беларусь, а ў некаторыя перыяды – і спрыяльная палітыка дзяржаўных польскіх улад па падтрымцы і развіцці адукацыйных

установоў, дзе дзеці маглі б  вывучаць родную мову, мелі пэўны вынік. Школы з вывучэннем беларускай мовы даволі паспяхова функцыянуюць да сённяшняга часу. Гэтыя адукацыйныя пляцоўкі, асабліва гімназіі і ліцэі ў Бельску Падляскім і Гайнаўцы, вельмі часта з'яўляюцца своеасаблівымі цэнтрамі захавання і развіцця беларускай нацыянальнай культуры на Падляшшы, а таксама цэнтрамі фарміравання і падтрымкі нацыянальнай самасвядомасці маладых прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Хто ёсць хто сярод беларусаў свету / Энцыкл. даведнік. Ч. 1. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах / рэдкал.: А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2000. – 334 с.

2. Raport z wyników. Narodowy Spis Powszechny Ludności i Mieszkań 2011. – Warszawa: Zakład Wydawnictw Statystycznych, 2012. – 177 s.

3. *Iwaniuk, S.* Szkolnictwo białoruskie na Białostocczyźnie w latach 1944–1980 / S. Iwaniuk // Białorusini – Historia i Kultura / red. naukowa J. Jurkiewicz. – Szreniawa: EXPOL, 2010. – S. 209–221. Białorusini – historia i kultura: zbior pt. Konferencji naukowej, Szreniawa, 25–26 czerwca 2010 / pod red. J. Jurkiewicza. – Szreniawa,

4. Беларуская дыяспара. Нарысы гісторыі і сучаснага стану / М. М. Бацян [і інш.]. – Мінск: Трыалета, 2006. – 160 с.

5. *Фіёнік, Д.* 50 гадоў. Беларускае грамадска-культурнае таварыства / Д. Фіёнік. – Беласток:  Ортдрук. – 159 с.

6. Беларускі каляндар 1973 / рэд. Г. Валкавыцкі. – Беласток, 1973. – 272 с.

7. *Швайко, В.* Беларусы ў Польшчы / В. Швайко // Беларускае замежжа = Белорусское зарубежье / склад. Н. А. Голубева; Дэпартамент па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэсп. Беларусь; Нац. гіст. архіў Беларусі; Нац. гіст. архіў Беларусі ў Гродна; Беларус. дзярж. архіў-музей літ. і мастацтва. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – С. 258–289.


**(Дата падачы: 25.02.2021 г.)**